ПАЙСЦІ ПА-БРЫТАНСКУ

Як разгортваецца «брэксіт»?

У мінулую нядзелю адбыўся пазачарговы саміт Еўрапейскага саюза. Экстранная сустрэча кіраўнікоў краін Старога Свету была прысвечаны здзелцы Бруселя і Лондана аб выхадзе Вялікабрытаніі са складу арганізацыі. Лідары 27 краін — членаў Еўрасаюза зацвердзілі пагадненне аб умовах «брэксіту» і палітычную дэкларацыю, якая вызначае рамкі будучых адносін паміж Злучаным Каралеўствам і ЕС. Кіраўнік Еўрапейскага савета Дональд Туск па выніках саміту паведаміў, што цяпер чакаецца складаны перыяд «ратыфікацыі гэтых дамоўленасцяў і далейшых перамоваў». На думку старшыні Еўракамісіі Жан-Клода Юнкера, асноўным дасягненнем стала захаванне адзінства сярод 27 краін Еўрасаюза. А што чакае Вялікабрытанію, якім чынам вырашыцца галоўная інтрыга Старога Свету?

СКАЛА РАЗЛАДУ

Лондан апублікаваў канчатковы план «брэксіту» 15 лістапада. У асноўным гэта рамачныя пагадненні, якія патрабуюць больш дэталёвай прапрацоўкі. Так, застаецца нявырашаным пытанне аб мяжы Паўночнай Ірландыі, якое выклікала больш за ўсё спрэчак. Мяркуецца, што ў пераходны перыяд Паўночная Ірландыя захавае адзіную мытную тэрыторыю з ЕС, у сувязі з чым у Мытным саюзе ў гэты час будзе знаходзіцца і ўся Вялікабрытанія. Калі ж Брусель і Лондан да канца пераходнага перыяду не змогуць знайсці іншы спосаб вырашэння гэтага пытання, каралеўства застанецца ў Мытным саюзе назаўжды.

На саміце ЕС да 585 старонак асноўнага тэксту прыкладаліся тры пратаколы: па брытанскіх ваенных базах на Кіпры, а таксама па Паўночнай Ірландыі і Гібралтары (заморскай тэрыторыі Вялікабрытаніі, якая мяжуе з Іспаніяй). Дарэчы, апошні з пратаколаў паставіў пад сумнеў усю здзелку: іспанскі прэм'ер Пэдра Санчэс пагражаў не прыехаць на саміт у Брусель. Брытанскія СМІ пісалі, што пазіцыя Мадрыда можа абцяжарыць зацвярджэнне дакумента, паколькі для ЕС важна адзінства ў прыняцці рашэнняў.

Мадрыд не задавальняла, што ў дамове адсутнічалі выразныя фармулёўкі па ўмовах перамоў па Гібралтары (Скале, як яго яшчэ называюць). Іспаніі было важна захаваць свабоду перамяшчэння для сваіх падданых і забяспечыць умовы для добрасумленнай канкурэнцыі іспанскіх і гібралтарскіх кампаній. Рознагалоссі з Мадрыдам удалося пераадолець у самы апошні момант, пасля таго як за дзень да саміту, у мінулую суботу, Вялікабрытанія правяла перамовы з Іспаніяй пры пасярэдніцтве прадстаўнікоў ЕС.

У выніку прэм'ер Санчэс падтрымаў выніковы варыянт «брэксіту». Гібралтар быў выключаны з агульных перамоў паміж Вялікабрытаніяй і ЕС, а значыць, умовы яго гандлю з ЕС могуць адрозніваца ад правілаў, якія дзейнічаюць для астатняй часткі Злучанага Каралеўства. Пры гэтым любыя пагадненні будуць немагчымыя без папярэдняй згоды Іспаніі. Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй, у сваю чаргу, растлумачыла, што канстытуцыйны статус Гібралтара не зменіцца пасля «брэксіту» і гаворка аб «сумесным суверэнітэце» Вялікабрытаніі і Іспаніі над гэтай тэрыторыяй не ідзе.

ФРЭДЗІ FOREVER

Кіраўнік Еўрапейскага савета напярэдадані саміту ў актуальным кантэксце згадаў Фрэдзі Мэрк'юры, які пайшоў з жыцця 24 лістапада 1991-га. Дональд Туск у сваім «Твітары» працытаваў словы з песні гурта Queen пад назвай Friends will be Friends («сябры застаюцца сябрамі»). «Незалежна ад таго, як усё гэта завершыцца, відавочна адно: мы застанёмся сябрамі да канца дзён і на адзін дзень даўжэй», — заўважыў Туск. «Для ЕС гэта не час святкаванняў. Гэта сумны момант. Гэта трагедыя», — ахарактарызаваў прынятае ў Бруселі рашэнне па «брэксіце» кіраўнік Еўракамісіі Жан-Клод Юнкер. З другога боку, ён быў вымушаны прызнаць, што дасягнутае пагадненне — «найлепшае з магчымых». Падобныя думкі агучвалі шматлікія еўрапейскія лідары: яны шкадавалі аб сыходзе Вялікабрытаніі, але адзначалі, што трэба паважаць выбар брытанцаў. Напрыклад, прэм'ер-міністр Іспаніі Пэдра Санчэс назваў «развод» Злучанага Каралеўства з ЕС «сумным днём для ўсіх прыхільнікаў адзінай Еўропы».

А вось кіраўнік брытанскага ўрада Тэрэза Мэй поўная аптымізму з нагоды будучыні сваёй краіны і не падзяляе суму сваіх калег. Яна падкрэсліла, што ўхваленая ў нядзелю ў Бруселі здзелка з'яўляецца найлепшай з тых, якіх было магчыма дамагчыся, і «ўвасабляе ў жыццё тое, за што брытанцы прагаласавалі на рэферэндуме». Мэй таксама паўтарыла свае тэзісы пра тое, што, пакінуўшы ЕС, Вялікабрытанія верне поўны кантроль над сваімі межамі, спыніць усе выплаты Еўрасаюзу і больш не будзе абавязаная прымаць законы, што выпрацоўваюцца ў Бруселі. Акрамя таго, «брэксіт» павінен забяспечыць найлепшыя ўмовы для сельскагаспадарчай і рыбалавецкай галін Злучанага Каралеўства.

КАПЯЛЮШ МІСІС МЭЙ

Аднак далёка не ўсе падзяляюць аптымізм брытанскага прэм'ера. Рынкі з нарастаючай трывогай чакаюць 11 снежня, калі ў брытанскім парламенце павінна адбыцца галасаванне па «брэксіце». Прадказаць вынікі вельмі складана. Аднак аналітыкі ўпэўненыя, што сюрпрызы абавязкова будуць — з тым ці іншым знакам, адзначае vz.ru. Калі ў другі снежаньскі аўторак брытанскія заканадаўцы прагаласуюць за прапанаваны прэм'ер-міністрам Тэрэзай Мэй план выхаду з Еўрасаюза, то «развод» Злучанага Каралеўства і аб'яднанай Еўропы пройдзе «паважна і высакародна». Пры няўдалым для Мэй галасаванні магчымы цэлы шэраг сцэнарыяў, уключаючы паўторнае галасаванне, «бурны» выхад і нават правядзенне паўторнага рэферэндуму аб членстве каралеўства ў Еўрасаюзе. Ну і, вядома, не варта забываць і аб датэрміновых парламенцкіх выбарах.

Да рэферэндуму фінансавы свет Брытаніі ставіцца вельмі насцярожана. Так, у чэрвені 2016 года, калі адбыўся першы рэферэндум аб членстве Злучанага Каралеўства ў ЕС, фунт стэрлінгаў упаў на 13 працэнтаў. Зараз, калі меркаваць па настроях інвестараў, то, на іх думку, Тэрэза Мэй прайграе. Фунт, які многія аналітыкі лічаць даволі дакладным барометрам настрояў брытанцаў, млява рэагаваў ў апошнія тыдні на шэраг гучных заяў, уключаючы заяву аб згодзе падпісаць чарнавік дамовы. Цяпер ён, дарэчы, знаходзіцца на вельмі нізкім узроўні. Мэй, дарэчы, неабходна простая арыфметычная большасць пры галасаванні. Аднак большасць раскладаў у парламенце дазваляе зрабіць выснову, што атрымаць яе будзе цяжка. Дзясяткі кансерватараў, аднапартыйцаў прэм'ера, не хаваюць, што будуць галасаваць супраць яе плана. Зараз, нагадаем, яна кіруе краінай дзякуючы вельмі крохкай парламенцкай большасці — усяго толькі ў 13 галасоў.

Як адзначыла аўтарытэтная The Times, у Тэрэзы Мэй не так шмат шанцаў (на думку многіх аналітыкаў, верагоднасць таго, што яна пераможа, не дацягвае і да 50 працэнтаў). У падобных тонах малюе найбліжэйшую перспектыву кабінета Мэй і кантынентальная еўрапейская прэса, кажучы аб «пачатку канца кашмару», які захоплівае ўсю палітычную энергію Вялікабрытаніі на працягу двух з паловай гадоў. З іншага боку, французская газета Le monde заклікае аддаць належнае ўпартасці Тэрэзы Мэй. «Рэдка кіраўнік урада прымаў столькі ўдараў, падвяргаўся такім знявагам, сутыкаўся з такой колькасцю сарказму і здрад. Пачуццё абавязку дачкі пастара аказалася мацнейшае: гэта немагчымае пагадненне, аднак місіс Мэй у канчатковым выніку выцягнула яго з капелюша», — заўважыла выданне.

ТРЫВОГА ПЕРАД СВЯТАМІ

Існуе меркаванне, што ў выпадку паражэння пры першым галасаванні, якое адбудзецца 11 снежня, абстаноўка на рынках прымусіць палітыкаў змяніць сваё стаўленне і прагаласаваць на другім галасаванні, якое павінна прайсці не пазней, чым праз 21 дзень пасля першага, за план прэм'ера. Прынамсі, падобная сітуацыя склалася 10 гадоў таму, у кастрычніку 2008-га, па іншы бок Атлантыкі, калі амерыканскія кангрэсмены спачатку прагаласавалі супраць Праграмы выкупу дрэнных актываў (TARP), але падчас другога галасавання пасля абвалу рынкаў ўсё ж яе прынялі.

Аднак многія фінансісты сумняваюцца ў тым, што сітуацыя, калі брытанскія рынкі нават пахіснуцца, акажа ціск на палітыкаў. Дастаткова сказаць, што рэзкае падзенне фунта пасля галасавання ў 2016 годзе мала паўплывала на палітычны ландшафт Вялікабрытаніі. Адна з прычын гэтага заключаецца ў тым, што падзенне фунта прыводзіць да... росту на рынках. У FTSE 100 (вядучы індэкс, які разлічваецца па курсах ста кампаній з найбольшай капіталізацыяй) досыць шмат транснацыянальных кампаній, што каціруюцца на Брытанскай фондавай біржы, якія працуюць з доларамі і якім ідзе на карысць слабы фунт стэрлінгаў. У дачыненні да ўплыву на палітыкаў куды важнейшы рынак аблігацый, бо ён напрамую ўплывае на фінансы ўрада. Рынак аблігацый аднак усе два з лішнім «брэксітаўскія» гады паказвае дзіўную ўстойлівасць. Існуюць асцярогі і наконт таго, каб колькасць працаўнікаў плана прэм'ера па выхадзе каралеўства з ЕС у першым галасаванні не аказалася настолькі вялікая, што праводзіць другое будзе бессэнсоўна. Калі вярнуцца да чаканняў, то можна сказаць, што перамога Тэрэзы Мэй хутчэй за ўсё стане самым вялікім сюрпрызам. Якім бы ні быў вынік галасавання, тая акалічнасць, што яно пройдзе ў звычайна спакойныя перадсвяточныя дні, можа ўзмацніць яго ўздзеянне на рынкі. Так што апошнія дні гэтага года, магчыма, стануцца для брытанскай фінансавай сістэмы вельмі бурнымі.

І яшчэ. Як стала вядома Sunday Times, на выпадак абвастрэння ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Вялікабрытаніі Міністэрства абароны падрыхтавала план падключэння вайскоўцаў для патрулявання вуліц і спынення беспарадкаў. Мерапрыемствы распрацаваны афіцэрамі, якія курыруюць аперацыю Temperer, згодна з якой вайскоўцы выходзяць на вуліцы ў выпадку буйнога тэракту. Мінабароны разглядае ўжо ў першыя суткі надзвычайнай сітуацыі мабілізацыю каля 1200 вайскоўцаў, з наступным павелічэннем іх да 10 тысяч. Адным з раёнаў, куды могуць быць перакінуты салдаты, называецца графства Кент, адкуль жыхары Злучанага Каралеўства могуць патрапіць у Еўрасаюз.

Захар БУРАК.